В ряде случаев метаоператоры завершают стихотворный текст, выражают этическую оценку итоговой мысли произведения:

*Возрожденье в стихах футуризма / Полно космизма. / Бекать, / Мекать, / Задавать шарады / Иные рады… /* ***Откровенно говоря*** *– / Это зря* (Е. Л. Кропивницкий. «Возрожденье в стихах футуризма…» (1965));

*Дама слушала стихи мои. / Стихи мои / Показались ей не поэтичными, / Необычными, / Слишком натуралистичными, / Даже неприличными… /* ***Откровенно говоря*** */ Я стихи читал ей зря* (Е. Л. Кропивницкий. «Дама слушала стихи мои…» (1965)).

Метаоператоры со значением этической оценки сообщаемого в поэтических текстах XX–XXI вв. выполняют разные функции: служат для передачи чувств, эмоций, переживаний лирического героя; для характеристики межличностных отношений; для оценки явлений социальной жизни. Так, Евгений Кропивницкий в стихотворениях «Возрожденье в стихах футуризма…» и «Дама слушала стихи мои…» рассуждает о поэтическом творчестве и восприятии поэзии.

В первом стихотворении он высмеивает искусственность авангарда: футуризм для него – это игра в странные формы без особого смысла. Фраза «*Откровенно говоря – это зря*», включающая метаоператор, подчеркивает бесполезность таких экспериментов.

Во втором стихотворении поэт сталкивается с непониманием. Его стихи кажутся даме «*…не поэтичными, необычными, слишком натуралистичными, даже неприличными*». Итог «*Я стихи читал ей зря*», сопровождаемый метаоператором *откровенно говоря*, звучит как горькая шутка: искренность в искусстве часто остается невостребованной.

Евгений Кропивницкий говорит о разрыве между творцом и аудиторией, будь то модные течения или обывательский вкус. Его «откровенность» – способ показать, что поэзия не обязана нравиться, но и не должна становиться пустой игрой.

Таким образом, метаоператоры – это инструменты искренности и маскировки одновременно. Они позволяют поэтам сблизиться с читателем, разрушить ожидания, посмеяться над собой и миром. Их выбор в большинстве случаев случаен, автор добавляет их либо для связи предложений, либо для рифмовки, однако это может быть и осознанный жест, будь то попытка сказать «как есть» или намеренно подчеркнуть, что правды в поэзии не бывает.

## Литература


1 Лосева, С. В. Частицы в системе метатекстовых операторов : автореф. дис. … канд. филол. наук : 10.02.01 / Лосева Светлана Владимировна : Дальневост. гос. ун-т. – Владивосток, 2004. – 23 с.

2 Толковый словарь С. И. Ожегова и Н. Ю. Шведовой. – URL: https://www.slovari.ru/default.aspx?s=0&p=244 (дата обращения: 15.04.2025).



**УДК 37.091.33-028.22:004.92:811.161.3:811.111**



***В. А. Сцепчанка***


# ІНФАГРАФІКА ЯК ПРЫЁМ ВІЗУАЛІЗАЦЫІ


*У дадзеным артыкуле разглядаецца адзін з асноўных прёмаў візуалізацыі інфармацыі і вучэбных матэрыялаў – інфаграфіка. Разглядаецца значэнне і мэта інфаграфікі, яе віды і спосабы выкарыстання дадзенага прыёму пры правядзенні ўрокаў беларускай і англійскай мовы. У артыкуле прадстаўлены асноўныя правілы складання інфаграфікі, а таксама інтэрнэт-рэсурсы, якія выкарыстоўваюцца для стварэння візуальных матэрыялаў.*

Развіццё сучаснага свету патрабуе ад сістэмы адукацыі пастаяннай эвалюцыі і ўдасканалення. Тэхналогіі моцна паўплывалі на тое, як успрымае інфармацыю сучаснае пакаленне. Вялікая колькасць інфармацыі, змешчаная ў сціснутым і яркім фармаце прывяла да развіцця так званага “кліпавага мыслення”. “Кліпавае мысленне адносіцца да тэндэнцыі апрацоўкі інфармацыі кароткімі, фрагментарнымі, і часта паверхневымі кліпамі або ўрыўкамі. Яно з’яўляецца вынікам нашай абмежаванай увагі і імклівага характару лічбавага свету, у якім мы жывём” [1, с. 318].

Менавіта дадзеная акалічнасць і абумовіла ўзнікненне і развіццё вялікай колькасці метадаў візуалізацыі ў сучасным працэсе навучання. Адным з самым папулярных метадаў можна назваць інфаграфіку. “Інфаграфіка – гэта графічны спосаб прадстаўлення інфармацыі, візуалізацыя статыстычных дадзеных, мэтай якой з’яўляецца паведамленне аўдыторыі складанай, аб’ёмнай інфармацыі простым, зразумелым, даступным і наглядным спосабам” [2, с. 36].

Галоўнай ідэяй інфаграфікі з’яўляецца высокі ўзровень яе інфармацыйнасці, сцісласць інфармацыі, змешчанай у графічнай форме, але ў той жа час лёгкасць у падачы інфармацыі, візуальная прывабнасць малюнка або схемы, актуальнасць размешчанай інфармацыі, даступнасць матэрыялу, а таксама інтэрактыўнасць. Акрамя таго, для інфаграфікі часта характэрна персаналізацыя падачы інфармацыі, што дазваляе зрабіць матэрыял больш зразумелым і прывабным, а значыць дае магчымасць лепш засвоіць яго.

Інфаграфіка можа змяшчаць розныя віды візуальнай інфармацыі: схемы і блок-схемы, спісы разнастайных формаў, малюнкі і выявы па тэме, графікі, дыяграмы, табліцы і карткі. Розныя даследчыкі і вытворцы вызначаюць вялікую колькасць відаў інфаграфікі. Напрыклад, даследчыца Аіда Пачава вылучыла восем тыпаў інфаграфікі:

1) інфаграфіка-параўнанне;
2) інфаграфіка-сцэнар;
3) рэцэпты, інструкцыі;
4) тэсты, гульні;
5) інфаграфіка-схема;
6) інфаграфіка-калаж;
7) інфаграфіка-артыкул;
8) інфаграфіка-карта [3].

Матэрыял інфаграфікі, як правіла, вылучаецца сваёй актуальнасцю і значнасцю вывучаных і закранутых тэм, а таксама наяўнасцю займальных і цікавых фактаў, незвычайнай і важнай інфармацыяй, якая дапамагае зрабіць працэс навучання больш яркім і цікавым для вучняў. Гэтыя характарыстыкі дазваляюць настаўнікам лягчэй арыентавацца пры стварэнні інфаграфікі па тэме ўрока. Інфаграфіка дапамагае вучням не толькі зразумець і засвоіць складаныя нюансы і важныя дадзеныя, але і садзейнічае павышэнню матывацыі да вывучэння прадмета. Выкарыстанне інфаграфікі ў навучальным працэсе можа значна ўзбагаціць урокі, зрабіўшы іх больш інтэрактыўнымі і займальнымі, што, у сваю чаргу, садзейнічае больш глыбокаму засваенню матэрыялу і развіццю цікавасці да вывучэння як роднай, так і замежнай мовы.

Даследчыкі Г. Бекет и Т. Слатер у сваёй працы адзначылі, што выкарыстанне інфаграфікі не толькі дапамагае сфарміраваць моўныя навыкі і ўменні, але і садзейнічае фарміраванню “акадэмічных навыкаў, звязаных з развіццём крытычнага аналізу, дыскурсіўных здольнасцяў, уменняў працаваць у камандзе, творчых здольнасцяў” [4].

На аснове практычнага досведу можна вылучыць некалькі найбольш распаўсюджаных і эфектыўных прыёмаў працы з інфаграфікай, якія значна ўзбагачаюць працэс навучання, робяць яго больш цікавым, запамінальным і карысным. Па-першае, адным з ключавых метадаў з’яўляецца каменціраванне, што мае на ўвазе як пісьмовае, так і вуснае пашырэнне і ўзбагачэнне тэкстаў. Дадзены падыход дазваляе вучням глыбей аналізаваць прадстаўленыя даныя, выяўляць ключавыя ідэі, моманты і факты, а таксама

развіваць навыкі крытычнага мыслення. Калі вучні засвойваюць уменне тлумачыць і інтэрпрэтаваць інфармацыю, яны не толькі авалодваюць матэрыялам, але і становяцца больш упэўненымі ў сваіх аналітычных здольнасцях.

Па-другое, арганізацыя дыялогу і дыскусій у рамках інфаграфікі з'яўляецца яшчэ адным эфектыўным прыёмам. Удзел вучняў у абмеркаванні інфармацыі садзейнічае актыўнаму абмену думкамі і ідэямі, што дапамагае стварыць атмасферу супрацоўніцтва і ўзаемаразумення ў класе. Такія абмеркаванні не толькі развіваюць камунікатыўныя навыкі, але і дазваляюць вучням лепш засвойваць матэрыял, таму што дадзены метад дае магчымасць высвятляць незразумелыя моманты, абмяркоўваць іх, выказваць свае ідэі.

Акрамя таго, важным аспектам працы з інфаграфікай з'яўляецца магчымасць для вучняў выказаць уласнае стаўленне да тэмы і свае меркаванні наконт яе. Гэта можа быць рэалізавана як праз пісьмовыя водгукі або сачыненні, так і праз вуснае абмеркаванне, дзе вучні дзеляцца сваімі думкамі і эмоцыямі адносна прадстаўленай інфармацыі. Такі падыход садзейнічае фарміраванню поўнага разумення тэмы, што робіць працэс навучання больш значным і займальным. Калі вучні бачаць, што настаўнік паважае іх меркаванні, яны становяцца больш упэўненымі і зацікаўленымі ў працэсе навучання.

Інфаграфіка часцей за ўсё служыць візуальным інструментам для прадстаўлення разнастайных статыстычных дадзеных, граматычных правіл і вынікаў даследаванняў. Яна можа прымаць розныя формы, такія як дыяграмы, графікі і табліцы. На аснове гэтых матэрыялаў вучні маюць магчымасць не толькі вывучыць інфармацыю, але і паспяхова ўзнаўляць яе пасля пэўнага прамежку часу. Аднак варта адзначыць і тое, што каментаванне гэтых візуальных матэрыялаў можа выклікаць у вучняў пэўныя цяжкасці.

Прычыны гэтых цяжкасцей могуць быць самымі разнастайнымі. Асноўнай цяжкасцю можна лічыць тое, што не ўсе вучні валодаюць навыкам інтэрпрэтацыі графічных дадзеных, што ўскладняе магчымасць здабываць ключавую інфармацыю і рабіць высновы, зыходзячы з яе. Для прадухілення гэтай праблемы настаўнікі павінны больш увагі надаваць працы з матэрыяламі інфаграфікі, тлумачыць схемы і табліцы, заахвочваць вучняў ствараць свае матэрыялы, спачатку з дапамогай настаўніка, а пасля самастойна.

Другой праблемай можа стаць перанасычанасць матэрыялу, змешчанага ў табліцы або схеме, залішняя яскравасць, наяўнасць вялікай колькасці элементаў, што можа заблытаць вучняў замест таго, каб дапамагчы з разуменнем тэмы. Для пазбягання дадзенай праблемы настаўнік павінен паглыбляць свае ўменні ў складанні матэрыялаў інфаграфікі, вывучаючы сучасную літаратуру і відэаматэрыялы па тэме.

Прымяненне інфаграфікі асабліва актуальна пры вывучэнні замежных моў. Абумоўлена гэта тым, што любая замежная мова мае адрозную ад роднай мовы структуру, розныя граматычныя асаблівасці і лексічныя адметнасці. Інфаграфіка дапамагае не толькі скласці зразумелыя і лагічныя схемы, але і сфарміраваць асноўныя веды пра замежную мову, зразумець яе структуру. Важна адзначыць, што пры выкарыстанні і складанні інфаграфікі па тэме ўрока настаўнік павінен выключна валодаць матэрыялам, так як толькі пры гэтай умове атрымаецца стварыць правільныя і цікавыя матэрыялы.

На ўроках беларускай мовы таксама вельмі карысна выкарыстоўваць прыёмы інфаграфікі, асабліва пры вывучэнні граматычных тэм або слоўнікавых слоў. Гэта дапаможа вучням сістэматызаваць інфармацыю і кампактна размясціць яе ў асабістых даведніках з мэтай паўтарэння ў будучым. Асабліва карысна выкарыстоўваць інфаграфіку пры падрыхтоўцы да ЦЭ і ЦТ, так як гэты працэс патрабуе запамінання вялікай колькасці інфармацыі, яе сістэматызацыю і магчымасць выкарыстання правіл у зручным фармаце.

Напрыклад, у ЦЭ і ЦТ у раздзеле "Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія" змешчаны заданні па тэме "Правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах". Для больш хуткага паўтарэння дадзенай тэмы можна выкарыстоўваць наступную схему-малюнак, якая змяшчае асноўную інфармацыю па кожным пункце, чым дапамагае хутка ўзнавіць веды па тэме (малюнак 1).




Малюнак 1 – Правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах

На ўроках англійскай мовы ў сучаснай школе інфаграфіку можна назваць абавязковай умовай, таму што яна дапамагае візуалізаваць новую, часам вельмі складаную, інфармацыю.

Вельмі карысным з’яўляецца выкарыстанне інфаграфікі пры вывучэнне і засваенні новага лексічнага матэрыялу па тэме. Але варта адзначыць, што пры выкарыстанні дадзенага прыёму матэрыялы павінны быць арганізаваны пэўным чынам. Пажадана, каб на выяве адсутнічаў пераклад на рускую або беларускую мовы. Інфаграфіка павінна змяшчаць слова на замежнай мове, па магчымасці яго транскрыпцыю і абавязкова малюнак, які яскрава адлюстроўвае значэнне дадзенага слова. Да перакладу настаўнік можа звярнуцца толькі ў крайнім выпадку. Вось прыклад, спампаваны з папулярнага дадатку Pinterest, таго, як можа выглядаць інфаграфіка па гэтым прынцыпе (малюнак 2).




Малюнак 2 – Вывучэне новай лексікі

Вялікая колькасць матэрыялаў па гэтай схеме размешчана ў свабодным доступе ў інтэрнэце, але настаўнік можа звяртацца па дапамогу да штучнага інтэлекту або наступных рэсурсаў: Visme – сайт, на якім размешчана вялікая колькасць гатовых шаблонаў, якія дазваляюць больш хутка сістэматызаваць інфармацыю, але дадзены рэсурс платны; PicsArt – фотарэдактар, у якім можна стварыць як схемы, так і малюнкі па тэме, мае бясплатную версію; Piktochart – электронны дадатак, які дае магчымасць ствараць на

аснове шаблонаў матэрыялы, дадатак платны, але частку функцый можна выкарыстоўваць без аплаты; Creately – мае не вельмі сучасны выгляд, але дапамагае хутка стварыць якасныя схемы. Варта адзначыць, што якасную інфаграфіку можна ствараць і з дапамогай Microsoft Word, але гэта патрабуе значна больш часу, чым выкарыстанне дадаткаў і сайтаў.

Асабліва карысна выкарыстоўваць інфаграфіку пры вывучэнні фразавых дзейнікаў англійскай мовы, каб адразу разумець розніцу паміж імі, ужыванні і правапісе прыназоўнікаў, прыставак і інш. Візуальнае ўспрыняцце інфармацыі дапамагае сфарміраваць больш трывалыя нейронныя сувязі, што забяспечвае трывалае засваенне тэмы.

Такім чынам, мы можам прыйсці да высновы, што інфаграфіка з’яўляецца сучасным і карысным інструментам, які здольны зрабіць працэс навучання больш цікавым і карысным. З дапамогай інфаграфікі складаны матэрыял можна зручна структураваць і размясціць, што паспрыяе больше паспяховаму засваенню і замацаванню любой тэмы. Аднак настаўніку варта звярнуць увагу на тое, што нават нягледзячы на значныя перавагі, праца з інфаграфікай можа выклікаць цяжкасці ў вучняў, асабліва ў сітуацыі, калі трэба інтэрпрэтаваць і каментаваць прадстаўленыя дадзеныя. Для пазбягання дадзеных праблем важна прымяняць разнастайныя метады навучання, такія як групавыя абмеркаванні тэмы, практычныя заняткі і аналіз прыкладаў. Гэтыя прыёмы дапамогуць вучням у развіцці крытычнага мыслення, палепшыць упэўненасць у аналітычных здольнасцях і ўменне эфектыўна абменьвацца меркаваннямі.

Такім чынам, інтэграцыя інфаграфікі ў адукацыйны працэс не толькі робіць яго больш дынамічным і інтэрактыўным, але і садзейнічае больш глыбокаму разуменню прадмета, што ў канчатковым выніку паляпшае якасць навучання і засваення матэрыялу. Ва ўмовах сучаснага інфармацыйнага грамадства, дзе візуалізацыя даных становіцца ўсё больш актуальнай, навыкі працы з інфаграфікай становяцца неабходнымі для паспяховай камунікацыі і прыняцця абгрунтаваных рашэнняў.

**Літаратура**

1 Bushuyev, S. Clip thinking in the digital age: complementary or contradictory / S. Bushuyev // ScienceDirect. – 2023. – November 7–9. – 317–322.

2 Практические основы преподавания русского языка как иностранного в условиях цифровой образовательной среды : учебно-методическое пособие / М. В. Холодкова, О. А. Дронова, Т. А. Дьякова, Ж. И. Жеребцова ; М-во науки и высш. обр. РФ ФГБОУ ВО «Тамб. гос. ун-т им. Г. Р. Державина». – Тамбов : Издательский дом «Державинский», 2022. – 96 с. – URL: htelibrary.tsutmb.ru/dl/docs/elib716.pdf (дата звароту: 07.04.2025).

3 Пачева, А. 8 типов инфографики. 2016 / А. Пачева. – URL: https://medium.com/@aidapacheva (дата звароту: 07.04.2025).

4 Beckett, G. H. Project-based Learning and Technology / G. H. Beckett, T. Slater // The TESOL Encyclopedia of English language teaching. Oxford, UK : Wiley Blackwell, 2018. – P. 1–7.

**УДК 004.92:070:004.738.5**

***М. А. Чорный***

## ИНФОГРАФИКА В СЕТЕВОМ ИЗДАНИИ SB.BY

*В работе исследуется роль инфографики как инструмента визуальной коммуникации в современных сетевых СМИ на примере белорусского издания SB.BY. Анализу подверглась инфографика в сетевом издании SB.BY с акцентом на проблематику, использование изображений и пиктограмм. Эмпирической базой исследования стали инфографические работы сетевого издания sb.by. Для изучения был взят следующий период с 01.06.2024 по 18.03.2025.*